**420.** Напоўніце «чароўны куфэрак» фразеалагізмамі з займеннікамі. Вызначце іх разрад.

1. Сёмая[м] вада на кісялі. 2. Кусаць сабе локці. 3. Ні ў якія вароты. 4. Пасля дожджыку ў чацвер. 5. І нашым і вашым. 6. Ад усяго сэрца. 7. Аж у роце чорна. 8. Не ў свае сані сесці. 9. На першы погляд. 10. Як ні ў чым не бывала. 11. На адзін капыл.

Які фразеалагізм мае значэнне ‘злы чалавек’? Разгледзьце фотаздымак ку́фра з роспісам майстроў з вёскі Агова Іванаўскага раёна. Што адлюстравана на куфры? Карыстаючыся рознымі крыніцамі інфармацыі, раскажыце пра гэтыя куфры.



**421.** Выканайце інтэрактыўнае заданне «Разрады займеннікаў па значэнні».

## § 66. Асабовыя займеннікі

**422.** Прачытайце табліцу. Вусна дапоўніце яе склонавымі пытаннямі і прыкладамі форм займеннікаў.

| Склон | Пытанне | Скланенне асабовых займеннікаў | | | |
|---|---|---|---|---|---|
| Н. | х т о? | *я* | *ты* | *мы* | *вы* |
| Р. | к а г о? | … | *цябе* | *нас* | … |
| Д. | … | *мне* | … | … | *вам* |
| В. | к а г о? | … | *цябе* | *нас* | … |
| Т. | … | *мной (-ою)* | *табой (-ою)* | *намі* | *вамі* |
| М. | *(пры)* к і м? | *(пры) мне* | … | … | *(пры) вас* |

Складзіце сказы з займеннікамі *я* і *ты* ў родным склоне.

!

**Асабовыя** займеннікі ***я*** і ***ты*** ўжываюцца толькі ў адзіночным ліку, а займеннікі ***мы*** і ***вы*** — толькі ў множным. Займеннікі *я, ты, мы, вы* не змяняюцца па родах.

Займеннікі 3-й асобы змяняюцца па ліках (*ён, яна, яно* (адз. л.); *яны* (мн. л.)) і па родах у адзіночным ліку (*ён* (м. р.); *яна* (ж. р.); *яно* (н. р.)). Усе асабовыя займеннікі скланяюцца.

**423.** Прачытайце тэкст, устаўляючы замест пропускаў займеннікі *ты* і *вы* ў патрэбнай форме. Вызначце тып тэксту.

### Памяць

Добра, калі ў … ёсць сшытак, у якім ты апісваеш сваю мясцовасць. Распытай у старых людзей, як называліся ў … паселішчы[с], невялікія рачулкі. Дзе ў … былі вадзяныя млыны, а дзе ветракі? Гэты сшытак заўсёды будзе з … . Як … хочацца назваць свой сшытак? Назаві яго «Памяць». Памяць — самае вялікае багацце[ф] чалавека *(Паводле В. Віткі)*.

Спішыце тэкст, падкрэсліце асабовыя займеннікі як члены сказа. Вызначце лік і склон займеннікаў 2-й асобы. На што яны ўказваюць?

Выпішыце з тэксту прыметнік у форме найвышэйшай ступені параўнання. Растлумачце, як ён утварыўся.

Вы складаеце кнігу «Памяць». Якія звесткі пра вызваленне вашага горада (вобласці, раёна) ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў вы маглі б падаць у кнігу?

## *Гавары і пішы правільна*

Займеннік ***вы*** можа ўжывацца пры звароце да адной ці некалькіх асоб. З малой літары гэты займеннік пішацца пры звароце да некалькіх асоб: *Без маці-Беларусі, без беларускай мовы* ***вы*** *будзеце сіротамі,* ***вам*** *стануць сцежкі вузкімі* (Р. Барадулін).

Вялікую літару выкарыстоўваюць у займенніку ***Вы*** пры ветлівым звароце да адной асобы: *Гляджу на* ***Вас****, і рады я да слёз, што мы жывём на гэтым белым свеце* (М. Шабовіч).

Вялікая літара пішацца пры звароце да асобы ў афіцыйных паперах, у тэкстах віншаванняў.

**424.** Прачытайце паведамленні ад сяброў і класнага кіраўніка.

Адкажыце на паведамленні, ужываючы займеннік *вы* ці *Вы*.

Выпішыце з тэкстаў паведамленняў словы з арфаграмай «Правапіс ***е, ё, я***».

Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку пры звароткку.









Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**425.** Прачытайце і адгадайце загадкі Р. Барадуліна. На назвы асоб ці прадметаў указваюць займеннікі? Зрабіце вывад пра ўжыванне займеннікаў 3-й асобы.



Вісіць яна,
На ёй вісяць,
Ніхто не прапануе: сядзь.
Для вопраткі пацешылка,
Яна завецца … .



Па іх ступаеш ты штодня,
Яны —
Густым[м] лугам радня.
Па іх
Ідуць нячутна сны,
Яны завуцца … .

Выпішыце з тэксту займеннікі 3-й асобы ў месным склоне. Вызначце іх пачатковую форму і праскланяйце.

Якое слова-адгадка мае амонім у рускай мове?

## *Гавары і пішы правільна*

У займенніках ***ён, яна, яно, яны*** перад галоснымі [о], [а], [і] вымаўляецца [й]: [йон], [йана], [йано], [йаны], [йіх], [йім].

**426.** Прачытайце.

1. Это был он, фокусник. Я ясно видел его и огромный шар у него в руках. 2. Это была она, моя мама. Я надеялся только на неё и боготворил её одну. 3. Это оно, озеро Свитязь! Я снова встретился с ним, я могу любоваться им! 4. Это они, олени! Тихонько наблюдай за ними, не спугни их!

Запішыце сказы па-беларуску. Вызначце склон, лік і род (калі ёсць) асабовых займеннікаў. Раскажыце пра вымаўленне і напісанне займеннікаў з прыназоўнікамі ў беларускай і рускай мовах.

## *Гавары і пішы правільна*

Займеннік 3-й асобы звычайна ўказвае на бліжэйшы да яго назоўнік такога самага роду і ліку: *Бруіцца белай радасцю* ***абрус.*** ***Ён*** *хлеб спавіў!* (Г. Булыка). Пры парушэнні правіла ўзнікае двухсэнсоўнасць: *Я дастала* ***сшытак*** *з* ***партфеля*** *і паклала* ***яго*** *на стол.* (На стол паклалі сшытак ці партфель?)

**427.** Прачытайце. Растлумачце, чаму сэнс сказаў незразумелы.

1. Андрэй сядзеў каля парку, а веласіпед стаяў побач з ім. 2. Ноўтбук ляжаў на стале, а каля яго Вера паклала навушнікі. 3. Клён рос каля гаража. Ён ужо стаў зялёным. 4. Арцём ехаў на мапедзе. Яго заўважылі сябры.

Перабудуйце сказы, каб пазбавіцца двухсэнсоўнасці.

**428.** Прачытайце тэкст, ужываючы займеннікі ў дужках у патрэбнай форме. Вызначце, што перадае назва тэксту: яго тэму ці асноўную думку.

**Яблык**

Дзед быў на рынку і купіў сабе яблык. Хацеў з'есці *(ён)*, ды перадумаў.

Дома дзед аддаў яблык унучцы Ніне. І толькі *(яна)* захацелася адкусіць, як прыйшла з работы мама.

— Мамачка, — сказала Ніна, — вазьмі з'еш яблык. Я частую *(ты)*.

Маці падзякавала Ніне, узяла яблык. Палюбавалася *(ён)*.

— Я Міхаську пачастую. Ён жа ў *(мы)* самы маленькі, — сказала маці.

Міхаська паглядзеў на ўсіх і папрасіў разрэзаць яблык на чатыры часткі.

— Гэта, дзядуля, *(ты)*, гэта маме, а гэта *(я)* і Ніне, — падзяліў ён. — Ешце, калі ласка, я *(вы)* частую *(Паводле В. Хомчанкі)*.

Колькі асоб удзельнічала ў размове? Ці мог Міхаська падчас звароту да каго-небудзь з субяседнікаў ужыць выразы *яна сказала, ён купіў, ёй дам* і падобныя? Абгрунтуйце сваю думку.

Спішыце апошні абзац тэксту, раскрываючы дужкі. Растлумачце пастаноўку знакаў прыпынку.

Раскажыце, як члены вашай сям'і клапоцяцца адзін пра аднаго. Якім учынкам у адносінах да сваіх родных вы можаце ганарыцца?

Займеннікі 3-й асобы не ўжываюцца ў адносінах да тых, хто ўдзельнічае ў размове.



Праваўладальнік Акадэмія адукацыі

**429.** Запішыце прыказкі, устаўляючы прапушчаныя асабовыя займеннікі.

1. Які Рыгорка, такая пра … і гаворка. 2. У … восем свят на тыдні. 3. Складна кумачкі пяюць, ды … веры не даюць. 4. Галава не толькі для таго, каб на … шапку насіць. 5. Не рабі каму бяды, бо сам … сустрэнеш.

Раскрыйце сэнс прыказак.

Вызначце, замест якой часціны мовы ўжываюцца займеннікі. Назавіце іх пачатковую форму.

## § 67. Зваротны займеннік *сябе*

**430.** Прачытайце. Вызначце тып тэксту. Падбярыце да тэксту загаловак у адпаведнасці з асноўнай думкай.

Словы «Спазнай самога **сябе**» належаць старажытнагрэчаскаму філосафу Сакрату. Але і сёння людзі імкнуцца спазнаць **сябе**. Кожны чалавек думае пра **сябе** як асобу, спрабуе разабрацца ў **сабе**, даць **сабе** ацэнку.

Неабходна ацэньваць **сябе** правільна, каб цябе паважалі, каб быць упэўненым у **сабе**. Правільная самаацэнка дапамагае чалавеку жыць у гармоніі з самім **сабой** і іншымі людзьмі.

Навошта чалавеку спазнаваць самога сябе?

На што ўказвае выдзелены займеннік? У якіх формах ён ужываецца?

**431.** Прачытайце табліцу. Параўнайце канчаткі займеннікаў *сябе* і *ты* ва ўскосных склонах. Дапоўніце табліцу формамі займенніка *сябе*.

| Склон | Скланенне займеннікаў *сябе, ты* | |
|---|---|---|
| Н. | — | *ты* |
| Р. | *сябе* | *цябе* |
| Д. | *сабе* | *табе* |
| В. | … | *цябе* |
| Т. | *сабой (-ою)* | *табой (-ою)* |
| М. | … | *(пры) табе* |

Складзіце і запішыце сказы з займеннікам *сябе* ў вінавальным склоне.